*Л.Ф. Голікава, дацэнт*

# АДЛЮСТРАВАННЕ ПАДЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСКІХ МУЗЫЧНА-ТЭАТРАЛЬНЫХ ТВОРАХ 1941–1945 гг.

Вялікая Айчынная вайна налажыла велізарны адбітак на лёс яе непасрэдных удзельнікаў і сучаснікаў, знайшла эмацыянальны водгук у творчых асоб і на многія гады заняла галоўнае месца ў іх творчасці. Тэма вайны надоўга вызначыла магістральную лінію мастацтва пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, кінематаграфістаў і кампазітараў. Сёння значную каштоўнасць уяўляюць творы, напісаныя ў гады вайны, у якіх увасоблены асабісты водгук творцы на падзеі, сведкам якіх ён з'яўляўся. У гэтым плане цікавыя, адкрытыя і непасрэдныя выказванні кампазітараў, якія сродкамі музыкі перадавалі пачуцці чалавека на вайне, рысавалі партрэт героя-сучасніка, удзельніка гераічнай бітвы.

Першымі такімі водгукамі на гераічныя падзеі сталі харавыя масавыя песні – найбольш мабільны музычны жанр. Многія з іх ствараліся не прафесійнымі кампазітарамі, а аматарамі, так бы мовіць, "на месцах, у народным асяроддзі", пераважна ў партызанскіх атрадах. Стваральнікі ваенных масавых песень звярталіся да тэкстаў Я.Купалы, П.Броўкі, А.Астрэйкі, М.Танка, П.Панчанкі, М.Машары і іншых беларускіх паэтаў. Сярод песень, створаных кампазітарамі, адзначым "Песню беларускіх партызан" (словы П.Броўкі) Я.Цікоцкага, "Ой, лясы мае, паляны" (словы А.Астрэйкі) Р.Пукста, "Праз лясы, балоты і паляны" (словы М.Танка) М.Аладава і інш. Гэта былі песні-маршы, песні-гімны, гераічныя балады, сярод якіх сустракаліся і элегічныя, лірычныя і нават сатырычныя песні.

Для большасці песень ваенных часоў характэрныя эмацыянальная яркасць мелодыкі, блізкая да сучасных нацыянальна афарбаваных песенных узораў, і разам з тым плакатнасць выказвання, маршавы актыўны рытм, заклікальныя аратарска-моўныя інтанацыі. Трэба дадаць, што галоўнай вартасцю некаторых з песень былі, аднак, не мастацкія якасці, а хутчэй высокі пафас і шчырасць пачуццяў. Тым не менш сваю ролю патрыятычнага заклiку да барацьбы і перамогі харавыя масавыя песні адыгралі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аб’ектыўныя абставіны трагічнага часу паўплывалі і на характар рамансаў, тэматыка большай часткі іх была прысвечана Айчыннай вайне, партызанскаму руху, патрыятычнаму апяванню вобраза Радзімы. Музычна-вобразны змест камерна-вакальных твораў такога роду, іх эмацыянальны тонус акрэсліваліся межамі гераічных аратарскіх воклічаў, суровага драматызму.

Традыцыйнымі становяцца так званыя рамансы-партрэты канкрэтных асоб (“Партызанка” А.Багатырова на словы С.Шчыпачова, маналог “Пра бацьку Міная” М.Аладава на словы А.Бялевіча), рамансы-партрэты Айчыны (маналогі А.Багатырова “Дарагая мая Беларусь” на словы П.Панчанкі і “Павей, вецер” на словы П.Пестрака). Менавіта ў рамансах-маналогах А.Багатырова, вакальная партыя якіх пабудавана на матывах, блізкіх да беларускіх народных лірычных песень “Павей, вецер” і “Ой, ляцелі гусі”, тэма Радзімы знаходзіць новае мастацкае ўвасабленне. Яна раскрываецца скрозь асобаснае, індывідуальнае ўспрыманне кампазітарам патрыятычнага зместу паэтычнага твора, што надае рамансам лірыка-ўсхваляваныя рысы, характар споведзі.

Асабістыя перажыванні, звязаныя з падзеямі ваеннага часу, знайшлі ўвасабленне ў рамансах Я.Цікоцкага (“Утаплю я гора”, “На скрыжаванні” на словы А.Астрэйкі, “За выраем” на словы В.Віткі) і М.Аладава (шэраг вакальных твораў яго прысвечаны тэме “жанчына і вайна” – “Пісьмо” на словы І.Уткіна, “Ты не будзеш сіратою” на словы А.Астрэйкі, “Рукавіцы” на словы Э.Агняцвет).

Ваенны перыяд для камерна-вакальнага жанру адметны і тым, што значна пашыраюцца межы выкарыстання беларускімі кампазітарамі паэтычнай спадчыны пераважна беларускіх паэтаў – А.Астрэйкі, В.Віткі, М.Машары, П.Пестрака, П.Панчанкі, К.Крапівы, П.Глебкі і інш. (у цэлым гэта адпавядала агульнаму настрою грамадства, накіраванага на барацьбу і перамогу).

У ваеннае пяцігоддзе новы этап наступае і ў развіцці кантатнага жанру. Гераічная барацьба з ворагам знайшла адлюстраванне ў героіка-патрыятычнай тэматыцы, а ўвасабленне – у героіка-эпічных і разам з тым публіцыстычных кантатах А.Багатырова “Ленінградцы” і “Беларускім партызанам” (абедзве 1942 г.), створаных як непасрэдны, эмацыянальна выказаны водгук кампазітара – услед за аўтарамі тэкстаў Джамбулам Джабаевым і Янкам Купалам – на падзеі Вялікай Айчыннай вайны.

У абедзвюх кантатах знаходзяць увасабленне героіка-драматычная і эпічная лініі творчасці А.Багатырова, што адбіваецца на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змесце сачыненняў і на іх драматургіі. У “Ленінградцах” героіка-прызыўныя, драматычныя крайнія раздзелы ўраўнаважваюцца разгорнутай сярэдняй часткай, якая выстройваецца па законах эпічнай драматургіі апавядальнага тыпу і будуецца на супастаўленні кантрастных эпізодаў. Кантата “Беларускім партызанам” па-мастацку больш сталая, лаканічная і лагічна пабудаваная, структура яе адпавядае структуры купалаўскага верша, у якім рэфрэнам для аб’яднання рознахарактарных эпізодаў служыць матыў са словамі “Партызаны, партызаны, беларускія сыны!” Ён паяўляецца на межах раздзелаў і выконвае функцыі матыву-звязкі, становіцца важкім элементам скразнога сімфанічнага развіцця музычнай тканіны і цэментуе форму кантаты.

Кантаты “Ленінградцы” і “Беларускім партызанам” – творы, у якіх злабадзённасць сюжэта не падмяняе мастацкія якасці і дзе пафасна-патрыятычная тэматыка, плакатнасць выказвання не перашкаджаюць успрыманню кантат як сачыненняў прафесійна сталых, чаму ў значнай ступені садзейнічае дэмакратызм музычнай мовы, аснову якой складаюць інтанацыі народнай і масавай песні.

Падзеі Вялікай Айчыннай вайны знайшлі адлюстраванне і ў інструментальных жанрах – сюіце “Памяці Вялікай Айчыннай вайны” (1944) М.Чуркіна, драматычнай сімфоніі-баладзе “У суровыя дні”, сімфанічнай паэме “З дзённіка партызана” (абедзве 1942 г.) М.Аладава. (Да іх можна аднесці і вялікае драматычнае палатно – паэму “Беларусь” А.Клумава, работа над якой была пачата ў канцы 1943 г. Скончыць паэму перашкодзіла смерць кампазітара.) Мабільныя адначасткавыя праграмныя жанры, з дапамогай якіх стала магчымым апавядаць пра ваенныя падзеі мовай музыкі, аказаліся найбольш перспектыўнымі: у іх увасоблены гераічныя старонкі вайны, канкрэтызаваныя ў аўтарскай праграме.

М.Аладаў, як ніхто іншы з беларускіх кампазітараў таго часу, імкнуўся сродкамі інструментальнай музыкі ўвасобіць сучасную тэматыку, нават злабадзённую, надаць музычным вобразам мастацкую абвостранасць, гратэскнасць. Так, у паэме “З дзённіка партызана” зазначаныя асаблівасці стылістыкі дазволілі кампазітару ўвасобіць канкрэтную задуму. Творча пераасэнсаваны М.Аладавым рэальны факт ваеннага часу быў пакладзены на мову музыкі і абумовіў музычна-вобразную сферу сімфанічнага твора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У паэме асноўным аўтарскім прыёмам становіцца комплекс музычных выразных выяўленчых сродкаў (яркіх гукаілюстрацыйных эпізодаў, прыёмаў абагульнення праз жанр і “выяўленчая” трактоўка жанру – скажоны матыў папулярнай нямецкай песенькі “Ах, мой мілы Аўгусцін” выкарыстаны ў якасці гратэскавага фашысцкага марша і г.д.), што дазволіла М.Аладаву зафіксаваць у музычным тэксце развіццё ваенных падзей.

Трэба адзначыць, аднак, што змест “Дзённіка партызана” не абмежаваны толькі аналогіяй з рэчаіснасцю і выходзіць далёка за межы знешняй апісальнасці. У сімфанічным палатне раскрываецца “другі пласт” мастацкага мыслення кампазітара – не толькі з пазіцыі сучасніка і сведкі канкрэтных падзей і з’яў, а з пункту гледжання абагульненага іх успрымання і ацэнкі (“думкі ад аўтара”), што надае сімфанічнаму твору асаблівую псіхалагічную глыбіню і драматызм.

У канцы вайны ваенная (партызанская) тэма ў рэшце рэшт знайшла адлюстраванне і ў музычна-тэатральным мастацтве. У беларускай опернай творчасці ваеннага перыяду “Алеся” Я.Цікоцкага заняла асобае месца. Гэта ўсхваляваны і шчыры аповед кампазітара пра лёс юнай партызанкі Алесі, асабісты позірк аўтара, часам непасрэдны і наіўны, на гераічныя і разам з тым трагічныя падзеі ваеннага часу, яго ўклад у скарбніцу беларускай партызанскай тэматыкі.

Створаная ў 1944 г. паводле лібрэта П.Броўкі опера адразу ж прывабіла выканаўцаў і гледачоў не толькі цудоўнай музыкай, але і дакументальнасцю гераіка-патрыятычнага зместу, які ўспрымаўся сучаснікамі як увасабленне рэальных падзей на тэатральнай сцэне, эмацыянальна адлюстраваных аўтарам музыкі. Выдатны меладыст, Я.Цікоцкі здолеў стварыць па-сапраўднаму народную оперу, у якой фальклорная стылістыка арганічна спалучалася з інтанацыямі сучаснай масавай песні, што надало асобы лірычны каларыт музычна-драматычнаму дзейству.

Пастаўленая ў снежні 1944 г. “Алеся” завяршыла спіс музычных твораў эпохі ваеннага ліхалецця і стала своеасаблівым прадвеснікам будучай перамогі, першым творам, якім закончыўся пэўны гістарычны перыяд.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ